Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-06-28

# На тым тыдні...

✓ **19 чэрвеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё III Мінскага міжнароднага біенале сучаснага жывапісу **«Colorfest»**. Мэта біенале – садзейнічанне стварэнню станоўчага іміджу Беларусі на еўрапейскім мастацкім полі, падтрымка аўтараў, якія ствараюць інавацыйныя працы. У біенале прымаюць удзел мастакі з Украіны, Беларусі, Эстоніі, Малдовы, Латвіі, Літвы і Палесціны. Сёлетні ганаровы госць мерапрыемства – Венесуэла.

Біенале працягнецца да 10 верасня.

✓ **19 чэрвеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя выдання «Полоцк»** серыі «Древнейшие города Беларуси». Да прэзентацыі была арганізаваная выстаўка «Патрыярх гарадоў беларускіх» (да 1150-годдзя Полацка), дзе прадстаўленыя выданні XVI–XXI стст., што распавядаюць пра багатую на падзеі гісторыю горада: «Дневник последнего похода Стефана Батория на Россию...», выдадзены расійскім гісторыкам Міхаілам Каяловічам (1867), «Записки о Московской войне, 1578–1582» (1889) польскага гісторыка, сакратара караля Стэфана Баторыя Рэйнгольда Гейдэнштэйна.

✓ **21 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа напярэдадні Дня ўсенароднай памяці ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны адбылося адкрыццё выстаўкі з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея **«Мастакі на вайне»**. Аснову выстаўкі склалі графічныя працы, малюнкі, сюжэтныя замалёўкі, партрэты, сатырычныя плакаты і карыкатуры франтавых і партызанскіх мастакоў. Працы выкананыя ў перыяд 1943–1945 гг. мастакамі, якія былі на фронце і ў партызанскіх атрадах на Віцебшчыне, якія ўдзельнічалі ў вызваленні горада і вобласці.

Працы мастакоў М. Гуціева, М. Абрыньбы, У. Кіпеля, А. Ткачонка, А. Мазалёва. Не ўсе яны ўраджэнцы беларускай зямлі, але іх лёсы цесна перапляліся з нашай краінай: яны вызвалялі яе ад фашысцкай навалы, многія затым працавалі ва ўстановах культуры і адукацыі Беларусі.

✓ **21 чэрвеня** ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбыўся **канцэрт «Немец пры двары Радзівілаў» квартэта «Riviera»** (мастацкі кіраўнік Максім Расоха). Выконваліся творы нямецкага кампазітара пры двары Радзівілаў Яна Давіда Голанда (1746–1827).